ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO.4 (3030) ● ● ЧАЦВЕР, 1 ЛЮТАГА, 2007



**Мільён адкрыццяў**
Нацыянальны гістарычны архіў выдаў даведнік сваіх фондаў
**Стар. 2**



**Знічкі Айчыны**
**Стар. 3**

**Беларусь адправіць на “Еўрабачанне” Калдуна**
Дзмітрый Калдун стаў пераможцам Нацыянальнага тэлевізійнага праекта “Еўрафэст” — адборачнага этапа “Еўрабачання-2007” **Стар. 4**

СУСТРЭЧЫ

# Напярэдадні юбілею Напалеона Орды



Ул. Р. Шчасны

Уладзімір Рыгоравіч ШЧАСНЫ з’яўляецца старшынёй Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА. Раней працаваў у Службе пісьмовых перакладаў Сакратарыята ААН, у беларускім пасольстве ў Літве, быў Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Вялікабрытаніі. Цяпер, як і раней, працуе ў Міністэрстве замежных спраў. Наша першае знаёмства адбылося падчас сесіі Генеральнай асамблеі ААН у Нью-Йорку, калі мы супольна ладзілі вечарыну ў ААН, прысвечаную 500-годдзю з дня нараджэння Францыска Скарыны, хадзілі да дырэктара Фундацыі Пірпонта Моргана, марна спадзеючыся, што там знойдзецца Крыж Ефрасінні Полацкай. Плённымі былі нашы кантакты ў “англійскі” перыяд працы Уладзіміра Рыгоравіча. Тады яму ўдалося арганізаваць перадачу на Гродзеншчыну некалькіх твораў нашага суайчынніка, вядомага мастака Мар’яна Богуша Шышкі, прыезд туды ж яго ўдавы лэдзі Сіселі Сондэрс, пачынальніцы руху па стварэнню хоспісаў у свеце. У апошнія гады сустрэчы сталі адбывацца часцей. Нядаўняя была прысвечана хуткаму (11 лютага) юбілею — 200-годдзю з дня нараджэння мастака, кампазітара, піяніста, педагога, грамадскага дзеяча Напалеона Орды. Паводле рашэння ЮНЕСКА, гэтая дата будзе адзначацца не толькі на яго радзіме, у вёсцы Варацэвічы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці, не толькі ў Мінску, але і ва ўсім свеце.

**— Дазволю сабе прыгадаць, што ў свой час, прыкладна год назад, “Голас Радзімы” змясціў цэлую старонку, прысвечаную нашаму славутаму суайчынніку. Гэта быў артыкул начальніка аддзела культуры Іванаўскага райвыканкама Уладзіміра Шэляговіча і навуковага супрацоўніка мясцовага музея Ларысы Дрычыц “Памяць пра Напалеона Орду вяртаецца ў Іванава”. Заканчвалася публікацыя словамі спадзявання на тое, што 11 лютага 2007 года, цытую, “увойдзе ў каляндар памятных дат ЮНЕСКА”. Скажыце, калі ласка, паважаны Уладзімір Рыгоравіч, як прайшло гэтае “ўваходжанне”? Лёгка?**

*— Без аніякіх пярэчанняў. Таму што абгрунтаванне было складзена пераканаўча. Таму што спадчына Орды мае не толькі нацыянальнае, але і шырэйшае, рэгіянальнае значэнне, з’яўляецца здабыткам не толькі беларусаў і палякаў, але і, скажам, літоўцаў, украінцаў, бо наш юбіляр вандраваў па іх землях, увекавечваў на малюнках іх помнікі архітэктуры. Мае значэнне ён і для французаў, бо жыў у Парыжы, вёў там грамадскую дзейнасць, узначальваў італьянскую оперу, выдаваў кнігі па мастацтву, браў урокі музыкі ў самога Шапэна.*




Помнік Напалеону Ордзе ў горадзе Іванаве Брэсцкай вобласці

**— Дарэчы, пра Парыж. Калі мне вясной 2005 года ўдалося некалькі дзён папрацаваць там, у Музеі Адама Міцкевіча і Польскай бібліятэцы, над рукапісамі нашых суайчыннікаў, на некалькіх лістах Орды мне кінуўся ў вочы адрас, дзе яны былі пісаны і адкуль адпраўлены: вуліца Людовіка Вялікага, 9.**

*— Копіі тых лістоў былі перададзены Міністэрствам замежных спраў згодна з яго планам работы па вяртанню гістарычнай і культурнай спадчыны кіраўніцтву Іванаўскага раёна, якое робіць вельмі шмат для ўшанавання памяці земляка.*

**— Так. Дык вось, вечарам таго ж дня я сказаў паслу Рэспублікі Беларусь у Францыі Віктару Шыху, чалавеку дасведчанаму і дбайнаму пра культурную спадчыну, што вось, маўляў, цяпер ёсць месца і ў Парыжы, дзе можна прымацаваць мемарыяльную дошку ў гонар нашага земляка. Потым, ведаю з электроннага паслання, спадар Шых выбраўся з жонкай у нядзелю на тую вуліцу, адшукаў той дом... Дык будзе дошка? І мерапрыемства ў Парыжы?**

*— Павінны быць. У канцы мая. Адкрыццё дошкі рыхтуецца, яе праект цяпер узгадняецца ў Прэфектуры Парыжа. На ўсякі выпадак, падам па-французску адрас таго будынка, дзе працаваў наш суайчыннік: Rue Louis-Le-Grand, 9. А ў штаб-кватэры ЮНЕСКА адбудзецца выстава, прысвечаная жыццю і дзейнасці Напалеона Орды.*

→ стар. 4

КОРАТКА

## Зноў у космас

Навукоўцамі распрацоўваецца праект новага беларускага касмічнага спадарожніка. Як паведаміў першы намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Петр Віцязь, тэрміны, у якія спадарожнік будзе створаны, залежаць ад таго, які варыянт выбіруць эксперты — аналаг “БелКА” ці апарат з новымі параметрамі. Спадарожнік павінен быць запушчаны не пазней, чым праз тры гады.

## Узаемны інтарэс

У беларуска-кітайскіх адносінах зроблена стаўка на рэалізацыю буйных інвестыцыйных праграм. Аб перспектывах развіцця двухбаковага ўзаемадзеяння ішла гутарка ў Пекіне на пасяджэнні беларуска-кітайскай камісіі па гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву. Дасягнута дамоўленасць аб стварэнні сумеснай вытворчасці беларускіх трактароў у Кітаі, падпісаны кантракт аб крэдытаванні кітайскім бокам рэканструкцыі Мінскай ТЭЦ-2. Абедзве краіны зацікаўлены ў тым, каб беларускія спецыялісты паступова далучаліся да асваення і мадэрнізацыі шэрагу рэгіёнаў КНР.

## На мяжы

Беларусь і Польшча ў хуткім часе пачнуць рэдэмаркацыю мяжы. Летась пагранічнікі з дзвюх краін правялі даследаванне сумеснага ўчастка мяжы. Быў вывучаны стан пагранічных знакаў, сфатаграфаваны і абноўлены іх пашпарты. У ходзе рэдэмаркацыі кожны знак будзе адрэстаўраваны, лінія ж мяжы застанецца нязменнай.

## Жыццё — у стагоддзе

100-гадовы рубеж пераадолелі 725 жыхароў Беларусі. Сярод беларускіх доўгажыхароў пераважаюць прадстаўніцы слабага полу: 100-гадовую ўзроставую планку пераадолелі 637 жанчын і толькі 88 мужчын. А ва ўзроставай групе старэй за 110 гадоў — толькі жанчыны. Так, 110 —114 гадоў адсвяткавалі васемнаццаць бабуль, а 115 і болей — чатыры.

## Гатовы да перамогі

З 9 па 11 лютага ў Мінску пройдуць сустрэчы 1/8 фінала розыгрыша Кубка Дэвіса паміж зборнымі Беларусі і Швецыі. У сталічным Футбольным манежы, дзе пройдзе матч, закончылася ўкладка новага корта. Беларускія тэнісісты, сярод якіх нашы зоркі Максім Мірны і Уладзімір Валчкоў, прыступілі да трэніровак.

Кацярына Немагай

# Калекцыя, якая адлюстроўвае жыццё

## Персанальная выстава літоўскага фотамастака Антанаса Суткуса “Штодзённыя архівы” збірае гледачоў у сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва

**Ірына Цімафеева**



Антанас Суткус задаволены поспехам сваёй выставы

Па словах дырэктара музея, народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча, прадстаўляць творчасць сусветна вядомага майстра фотамастацтва для музея вялікі гонар. Ён падкрэсліў, што музей і далей будзе пашыраць знаёмства беларускай публікі з лепшымі прадстаўнікамі выяўленчага мастацтва іншых краін, у тым ліку Літвы, Латвіі і Эстоніі.

У сваім выступленні Часовы Паверaны па справах Літвы ў Беларусі Мар’юс Януконіс назваў Антанаса Суткуса адным з самых яркіх і фундаментальных фотамастакоў Літвы. Гэта ўжо не першая выстава работ майстра — летась яго экспазіцыя выстаўлялася ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

На адкрыцці сваёй выставы мастак адзначыў, што за апошнія два гады гэта экспазіцыя пабывала ў многіх краінах Еўропы. “Фатаграфіі, якія на ёй прадстаўлены, акцэнтуюць увагу на тым жыцці, за якое не трэба плаціць, — штодзённым шчасці, адносінах паміж людзьмі”, — гаворыць фотамастак. Ён выказаў надзею, што выстава дапаможа развіццю добрасуседскіх адносінаў Беларусі і Літвы.

Цікавая гісторыя нараджэння экспазіцыі “Штодзённыя архівы”. З 1959 года малады фотажурналіст быў вымушаны складаць у асобую папку свае працы, якія не адпавядалі канонам сацрэалізму. Пазней Антанас Суткус стаў лідэрам літоўскай фатаграфіі, шмат гадоў быў старшынёй адзінага ў СССР Таварыства фотамастацтва, але і далей працягваў папаўняць запаветную папку — многае не месцілася ў рамках камуністычнай ідэалогіі.

У 1993 годзе, калі ў Літве ўжо не было цэнзараў, аўтар “выявіў” у сябе цудоўную калекцыю, якая надзіва дакладна адлюстроўвала жыццё літоўскага грамадства.

# Аповесць і апавяданні пра гісторыю

**Алеся Пінчук**

**Прэзентацыя новых кніг Наталлі Голубевай “Радзімічы” і “Лёсу зменлівыя аблічы” прайшла ў Мінску**

У аповесці “Радзімічы” літаральна па часцінках сабраны унікальны матэрыял аб жыцці, традыцыях, абрадах і гісторыі нашых далёкіх продкаў-радзімічаў, дакладна і яскрава адлюстраваны малюнкі таго часу. Па словах пісьменніцы, галоўная задача аповесці — праўдзіва расказаць пра тое, як у IX-X стагоддзях жылі беларусы. У кнізе няма выдумкі, увесь матэрыял максімальна набліжаны да рэчаіснасці, па ім чытач нават можа вывучыць гісторыю, лічыць пісьменніца. Выдадзены таксама буклет, на старонках якога прадстаўлены ўпрыгожанні, адзенне, прадметы побыту, абрады. Наталля Голубева з’яўляецца аўтарам шматлікіх публікацый. Сярод іх такія работы, як “Беларусь: вопыт самастойнасці”, “Калабаранты. Гісторыя без белых плямаў”, “Прынцып раўнавагі”, “Ідэя, вакол якой здолеем аб’яднацца”, і іншыя.

# Сцяг старажытнага Полацка на Эверэсце

**Дарэчы, не толькі сцяг Полацка, але і капсула са святой зямлёй са Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра будуць у хуткім часе ўзняты на самую высокую гару свету**

Ідэя разгарнуць на вышыні 8848 метраў сцяг старажытнага беларускага горада належыць ураджэнцу Полацка, а цяпер расійскаму прадпрымальніку з горада Партызанска (Прыморскі край) і альпіністу Сяргею Батуру. Узыходжанне каманды, у склад якой войдзе беларус, пачнецца ў красавіку і будзе доўжыцца каля двух месяцаў.

# З Гомеля ў Рыгу

**Юрый Анісімаў**



Камфортнасць — рыса авіяпералётаў

У сакавіку пачне дзейнічаць рэгулярны авіярэйс па маршруце Рыга — Гомель — Рыга. Адпаведная дамова падпісана ў Гомелі паміж рэспубліканскім авіяцыйным унітарным прадпрыемствам “Аэрапорт “Гомельавія” і латвійскай авіякампаніяй Air Baltic Corporation.

Як паведаміў намеснік генеральнага дырэктара латвійскай авіякампаніі Гюнтэр Салінгер, дагэтуль Air Baltic Corporation цесна супрацоўнічала з авіякампаніяй “Белавія”, што і стала падставай для пашырэння сувязяў.

Першы авіяпералёт запланаваны на 26 сакавіка. Рэйс будзе ажыццяўляцца тры разы на тыдзень. Прадстаўнік латвійскай кампаніі паведаміў, што расклад палётаў складзены такім чынам, каб пасажыры, якія будуць карыстацца гэтым рэйсам, мелі магчымасць не губляючы часу ажыццявіць далейшы пералёт з Рыгі яшчэ ў 33 краіны.

# Чытач не застанецца раўнадушным

**Анна Тугарына**

**Адбылася прэзентацыя новага энцыклапедычнага слоўніка “Беларуская міфалогія”**

Кніга з’яўляецца спробай сістэматызаваць, найбольш поўна апісаць і прааналізаваць міфалагічную спадчыну беларусаў. Аўтары слоўніка — фалькларысты, гісторыкі, археолагі, лінгвісты, філосафы — карпатліва працавалі над кнігай на працягу амаль дзесяці гадоў.

Энцыклапедычны слоўнік “Беларуская міфалогія” — другое выданне, якое папоўнілася алфавітным паказальнікам і малюнкамі. Кніга напісана даступнай мовай і прызначана для самага шырокага кола чытачоў. Першае выданне выйшла ў 2004 годзе і, па словах аўтараў, “не праляжала на паліцах кніжных магазінаў і года”, што сведчыць аб актуальнасці слоўніка.

# Мільён адкрыццяў

## Нацыянальны гістарычны архіў выдаў даведнік сваіх фондаў

**Віктар Корбут**

Тое, што Нью-Йорк раней называўся Новым Амстэрдамам і заснавалі яго галандцы, — гэта ўсім вядома са школьнага курса сусветнай гісторыі. Але вось што рабілі гэтыя самыя першаадкрывальнікі потым у нашых краях — дагэтуль застаецца загадкай. Інакш як растлумачыць, што галандскія рукапісныя карты Нью-Йорка XVII – XVIII стагоддзяў трапілі ў Мінск?

Аб картах стала вядома пасля выхаду даведніка “Фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі”. Тут апісаны мільён дакументаў апошніх сямі стагоддзяў, якія захаваліся да нашых дзён у мінскім сховішчы старажытнасцяў. Кніга, якая аформлена пад старажытны фаліянт, — компас для падарожніка па дарогах мінулага. Бо многія пергаменты да гэтай пары ляжаць некранутымі. Апошні раз архіў выдаваў такі даведнік у 1974 годзе. Папкі з каралеўскімі граматамі і царскімі ўказамі з тых часоў змянілі адрасы, ці, як гавораць вучоныя, шыфры, — і многае прыходзілася шукаць па натхненню.

Самыя каштоўныя тут — аўтографы вялікіх князёў літоўскіх, Радзівілаў, Сапегаў, тысячы роспісаў і адбіткаў сігнетаў (імянных гербавых пячатак на пярсцёнках) шляхціцаў. Трапляюцца запісы, зробленыя рукой Багдана Хмяльніцкага, продкаў Фёдара Дастаеўскага, справы, якія тычацца Васіля Цяпінскага, Тадэвуша Касцюшкі, Соф’і Слуцкай. Побач захоўваюцца дакументы аб прататыпе галоўнага героя пушкінскай аповесці “Дуброўскі” — удзельніку паўстання 1830–1831 гадоў Паўле Астроўскім…

Многія дакументы здольны змяніць нашы ўяўленні аб мінулым. Напрыклад, даведнік, распавядае пра тое, што ў 1873 годзе была арганізавана Заходняя экспедыцыя па асушэнню балот, якая была накіравана ў Мазыр. “Дакументы экспедыцыі захаваліся. Але пакуль ніхто іх не вывучаў”, — гаворыць Ларыса Лісава, намеснік дырэктара НГАБ. Між тым, выходзіць, меліярацыя савецкіх часоў — усяго толькі працяг мінулых дзён? Адказ мы чакаем ад гісторыкаў. Архівы не павінны маўчаць і пакрывацца пылам.



"На зямлі чалавечы след / Лёгка лёгкаму ветру сцерці"… А ёсць сляды, што падоўгу і пасля таго, як пакідае чалавек тыя ці іншыя сцежкі, застаюцца ў двух сусветах. На зямлі Айчыны, у пушчах і на вясковых прасёлках, на берагах рэк і рачулак. І яшчэ — у памяці самога гаспадара тых слядоў-слядочкаў. Дык ці сціраюцца яны?.. Адкрываючы даўнюю памяць, падоўгу ўзіраючыся ў яе напаўзабытыя ці зусім для некага страчаныя выявы, я думаю зараз пра гаспадароў, аўтараў многіх і многіх слядоў, пра нашых знакамітых суайчыннікаў, пра тых, хто ў вялікі свет выправіўся з малых гарадоў і мястэчак, хто здабываў славу Беларусі ў розных старонках свету, у далёкіх і блізкіх краінах мацаваў і шырыў. Яны — вялікія вучоныя і падарожнікі, легендарныя пераўтваральнікі ўкладу жыцця, военачальнікі, акцёры і рэжысёры, мастакі і пісьменнікі — сапраўдныя сляды Айчыны, яркія знічкі ў бясконцым касмічным палёце Зямлі. Давайце вернемся ў іншыя часы, згадаем, хто адкуль выйшаў у свет, хто церабіў сцежкі на Ігуменшчыне і паблізу Шчучына, на Валожыншчыне і ў Мядзельскім краі, на ўзгор'ях Лагойшчыны і ля руін Крэўскага замка… Пра вялікіх суродзічаў і іх радзімыя паселішчы — наш дарожны нататнік, навеяны і падказаны старымі паштоўкамі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава.



Выпуск Свіслацкай настаўніцкай семінарыі 1914 года

# Знічкі Айчыны


Знешні выгляд Настаўніцкай семінарыі

**Алесь Карлюкевіч**

А спярша выправімся ў Свіслач, у панадсвіслацкую старонку, да Поразава, Навасадаў, Несцяровічаў, Шамятоўкі, Верабейкаў, Гарнастаевічаў, да іншых мясцін і куточкаў гэтай зямлі, што і зараз праменіць-зіхаціць сваёй гісторыяй на памежжы Берасцейшчыны і Гародзеншчыны. Зямлі, якая выхавала-выпеставала спевакоў і пісьменнікаў, артыстаў і герояў паўстанняў.


Касцёл у Свіслачы (канец XIX ст.)

Як толькі ўдасца патрапіць вам у Свіслач, адразу агледзьце алею ў цэнтры горада, дзе ў адзін рад выстраіліся Каліноўскі, Траугут, Ленін, Сталін… Помнікі з розных часоў — сімвал гістарычнай шматаблічнасці. Яна, шматаблічнасць, між іншым, фарміравала і характары, праектавала лёсы сыноў і дачок Свіслаччыны. У горадзе па сённяшні дзень захаваўся будынак Свіслацкай гімназіі. Адкрыта навучальная ўстанова была як губернская ў 1804 годзе афіцыйным указам расійскага імператара Аляксандра І. І ехалі сюды за навукай з Брэсцкага, Пружанскага, Кобрынскага, Ваўкавыскага, Слонімскага і Гродзенскага паветаў. З выпускнікоў 1817 года — Віктар Гельтман. Служыў афіцэрам у войску. Праз свайго брата — вучня гімназіі Юзафа Гельтмана — кіраваў тайным таварыствам Свіслацкай гімназіі. Юных рэвалюцыянераў цікавілі сацыяльныя пераўтварэнні. З часам з гімназічных гурткоў — "навуковага" і "маральнага" — у Свіслачы ўзнікне "Маральнае таварыства", а пасля і арганізацыя "Заране". У канцы 1824 года, акрамя таго, што арыштуюць асобных удзельнікаў руху, царскія ўлады размесцяць у Свіслачы 1-ую роту 48-га егерскага палка. Ці не галоўным клопатам вайскоўцаў стала адсочванне "крамолы" ў гімназічных сценах.


Так выглядаў Свіслацкі вакзал у пачатку XX ст.

Але не толькі рэвалюцыянераў пеставала Свіслацкая гімназія. Прыблізна ў адзін час з Віктарам Гельтманам у яе сценах навукамі авалодваў Станіслаў Батыс Горскі. Закончыўшы пасля Віленскі універсітэт, ён загадваў універсітэцкім батанічным садам, калекцыя якога складала каля сямі тысяч відаў раслін з розных частак свету. Цікава, што імем Горскага названы некаторыя віды раслін, насякомых. Вучоны склаў каталог раслін батанічнага саду Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі, выдаў табліцы з малюнкамі 20 відаў раслін. За гонар мець знаёмства з Горскім лічылі вучоныя-прыродазнаўцы Падуі, Вены, Неапаля, Жэневы, Фларэнцыі. Колішні свіслацкі гімназіст забяспечваў іх гербарыямі і ўзорамі расліннасці Беларусі і Літвы.

Крыху пазней Горскага і Гельтмана вучыўся ў Свіслацкай гімназіі будучы пісьменнік, гісторык, выдавец, ілюстратар і бібліяфіл Юзаф Ігнацы Крашэўскі. Яго часта называюць "пружанскім Дзюма" (дзяцінства літаратара прайшло каля Пружан). Калі мець на ўвазе выключную літаратурную спадчыну, то, можа быць, і справядліва. Дзюма-бацька напісаў і выдаў дзесяткі гістарычных раманаў і аповесцяў. Толькі яго кніга "Мае мемуары" складае 22 тамы. А яшчэ — шматтомныя падарожныя нататкі "З Парыжа ў Астрахань". Інаш Крашэўскі — аўтар 232 (!) раманаў і аповесцяў, з якіх 88 — на гістарычныя тэмы. А ўвогуле спадчына яго, апроч мноства артыкулаў у часопісах і багатай эпісталярыі, складае 600 (!) тамоў. Побач з мастацкай прозай, паэзіяй нашчадкам засталіся дзесяткі цікавейшых навуковых, гісторыка-этнаграфічных прац.

У 1823 годзе Свіслацкую гімназію закончыў мастак, графік і кампазітар Напалеон Орда. У падарожжах па Беларусі, Літве і Польшчы замалёўваў замкі, сядзібы, архітэктурныя помнікі. З панарамных малюнкаў — і "Свіслач". Так што, пільней углядайцеся ў будынак былой Свіслацкай гімназіі. На сценах яго — адбітак многіх падзей.

"Ішоў чалавек і чамусьці свайму / Усміхаўся, таемным святлом сагрэты…" Можна толькі здагадвацца, колькі салодкіх мараў, колькі жаданняў знічкамі пранеслася па-над свіслацкай прасторай. Не так ужо і шмат такога кшталту адукацыйных, асветніцкіх цэнтраў. І калі хто зараз скептычна хмыкае, што, маўляў, тая Свіслач, якая зусім нядаўна выбралася ў "гарадскі чын" з "гарпасялковых абдымкаў", то карціць працытаваць успаміны графа Леана Патоцкага (1799 — 1864) пра Свіслач першай паловы дзевятнаццатага стагоддзя: "У самай сярэдзіне горада быў квадратны рынак, аздоблены спічастаю пірамідаю, што завяршалася доўгім пазалочаным шпілем. Вялі да яго з чатырох бакоў шырокія, пад шнур выцягнутыя вуліцы, забудаваныя ладнымі дамамі, пакрытымі гонтай, — Гродзенская, Рудаўская, Мсцібаўская, Брэсцкая і Варшаўская. Вуліца Гродзенская і рынак заселены былі яўрэямі, Варшаўская — татарамі, якія займаліся вырабам шкураў, па іншых месціліся студэнты, што хадзілі ў "школы". У самым цэнтры рынку паміж вуліцамі Мсцібаўскай і Рудаўскай узносіўся вялікі прамавугольны гмах, вымураваны з каменняў, з 48 склепамі або крамамі, прызначанымі для вальнага кірмашу, які штогод прыпадаў на жнівень месяц. За крамамі — маленькая грэка-уніяцкая царква. На самым рынку пяць пастаялых двароў: пад Арлом, Аленем, Валом, Аднарожцам і Лебедзем. У адным рагу аптэка, у другім кафегаўз або шынок, салідны , з більярдам, для забавы прыезджых. Насупраць кафегаўза распасціраўся вялікі пляц, на левым яго баку драўляны парафіяльны касцёл з гадзіннікавай вежаю. За ім гімназічныя гмахі, вымураваныя пасля смерці рэфендарыя. На правым баку тэатр з маскараднай залаю, жыллё Яцка Крусіньскага, дырэктара гімназіі, пасля — стайні і вазоўні. За імі парк, які называлі публічным, з гушкалкамі, каруселлю і храм. Ад самага канца пляцу, паміж палацавым садам і звярынцам, у якім трымалі да ста з нечым ланяў і больш за дзесятак аленяў, да двара вяла алея, абсаджаная алешынай. Парк пачынаўся ад квадратнага ставу з акруглай выспай пасярэдзіне. Ён меў плошчу каля дзесятка маргоў. Ад яго ішло адгалінаванне да звярынца, праз якое трэба было праязджаць па развадным мосце… Парк канчаўся драўляным будынкам, у якім размяшчалася аранжарэя і было некалькі пакояў для гасцей.

Недалёка адсюль, над самым краем вады, узносілася цудоўная мураваная альтанка. Палацавы дзядзінец атачалі штыкеты, мураваныя ў слупы. Не даязджаючы да яго — адміністрацыйны дом. Побач ішла дарога да гаспадарчых забудоваў. Сам палац стаяў бокам да парку. Некалькі аграмадных ліпаў аздаблялі яго дзядзінец…"

Атмасфера прыгажосці, упарадкаванасць жыцця, энергетыка сядзібаў — вось што спрыяла фарміраванню яркіх асоб у Свіслацкім краі. У далёкі вырай паляцела з свіслацкага мястэчка Поразава бібліёграф Юлія Бібіла. Неацэннасць руплівасці яе перш-наперш — у стварэнні аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі ў Дзяржаўнай бібліятэцы Беларусі. Зямляк Юліі Восіпаўны — кампазітар Яўген Паплаўскі. З Поразава — акцёр тэатра і кіно Віктар Шалкевіч. З вёскі Верабейкі — беластоцкі кампазітар і хормайстар Эдуард Гойлік ( у 1960-ыя — кіраўнік беларускага эстраднага ансамбля ў Беластоку "Лявоніха"). Берасцейскія паэты Анатоль і Васіль Дэбішы — з Шамятоўкі. Беларускі спявак Міхась Забэйда-Суміцкі, голас якога гучаў у "Ла Скала", Нацыянальным тэатры ў Празе, у Харбіне і Варшаве, — з Несцяровіч. Недзе ў Сібіры згубіліся сляды пісьменніка Паўла Малышэвіча, які нарадзіўся на былым хутары Багон.

Кожны са згаданых ураджэнцаў свіслацкай прасторы — асоба, неардынарны, яркі чалавек… Кожны як мог працаваў, рупіўся, не думаючы, заўважаць яго, адзначаць ці не. Кожны, хто здабыткамі край свой упрыгожыў, у душы трымаў паэтава вымярэнне : "Чалавек найшчаслівы, калі не заўважыць, / Як сумленна пражыць шанцавала яму".

© В поисках утраченного
Паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава.

# Беларусь адправіць на “Еўрабачанне” Калдуна

## Дзмітрый Калдун стаў пераможцам Нацыянальнага тэлевізійнага праекта “Еўрафэст” — адборачнага этапа “Еўрабачання-2007”

**Юлія Міхневіч**



**Песня “Work your magic” Дзмітрыя Калдуна стала пераможнай**

У фінале нацыянальнага тэлевізійнага праекта ўдзельнічалі Дзмітрый Калдун, Дзіяна Гурцкая і група “The Project”. Прафесіянальнае журы на перадфінальным этапе аддало сваю перавагу Дзіяне Гурцкой і групе “The Project”. А Дзмітрый Калдун прайшоў у фінал па выніках галасавання гледачоў.

Спявак рыхтаваўся да конкурсу грунтоўна. Песня “Анёл мары”, якая была прадстаўлена на канцэрце ў Палацы Рэспублікі, па словах Дзмітрыя, не падыходзіць да фармата “Еўрабачання”, і ён прыняў рашэнне ў фінале “Еўрафэста” выканаць іншую кампазіцыю. Пераможца расійскага праекта “Фабрыка зорак-6” запісаў у Фінляндыі песню “Get up” на музыку Ёргена Алаўсена, які працаваў у свой час з “Бон Джові” і Браянам Адамсам.

Дапамагаў Калдуну выйграць беларускі адборачны тур прадзюсар Віктар Дробыш і расійскі выканаўца Філіп Кіркораў. Разам яны ляталі ў Афіны, дзе быў зроблены запіс трэцяй па ліку, але ўжо пераможнай, кампазіцыі — “Work your magic”. Тэму песні падказала прозвішча Калдун, што значыць чараўнік, якое сугучна з назвай кампазіцыі.

Паўфінал “Еўрабачання-2007” адбудзецца ў Хельсінкі (Фінляндыя) 10 мая, фінал — 12 мая.

**Зміцер АРЦЮХ нарадзіўся 2 сакавіка 1978 года ў вёсцы Рутка Навагрудскага раёна. Скончыў Мінскі педагагічны каледж імя Максіма Танка, вучыўся на факультэце журналістыкі БДУ. Аўтар кнігі “Вясна ў кароткім паліто...”**

**Прапануем вашай увазе некалькі вершаў з гэтай кнігі.**

* * *

*За акном шалее завіруха —*
*Там няма для танца перашкод.*
*І яе верлібравыя рухі*
*Прымушаюць сесці ў маралёт.*

*І нясуцца думкі. Невядома,*
*Дзе прытулак знойдуць, ажывуць...*
*З мітусні вярнуся я дадому,*
*Каб паветра чыстага глынуць.*

***Чантарэі***

*Заснежаныя дрэвы ў Чантарэях*
*Маўкліва спяць.*
*Ім сняцца цуда-сны,*
*Што зноў вясна разбудзіць і сагрэе,*
*Што стануць зноў зялёнымі яны.*
*Ад белай футры стужка застанецца*
*Вады жывой,*
*Што ў Рутку пацячэ.*
*Яна ракі пяшчотна дакранецца*
*І новых стужак сабярэ яшчэ.*
*І курс на Нёман выбера імкліва,*
*Каб зноў вярнуцца снегам на Зямлю,*
*Каб ёлкі ў Чантарэях*
*Зноў шчасліва*
*Пачулі ад вясны:*
*“Я вас люблю!”*

***Навагрудак***

*Мне сніўся Ты і Навагрудак,*
*І я па горадзе сумую.*
*У ноч завею і залюю*
*Мне сніўся Ты і Навагрудак.*
*Ізноў я голас мамы чую,*
*Я ёй адной скажу пра смутак.*
*Мне сніўся Ты і Навагрудак —*
*І я па горадзе сумую.*

* * *

*Зіма ў зімовым Навагрудку —*
*Старонка памяці маёй*
*У кнізе “Радасны настрой”.*
*Зіма ў зімовым Навагрудку —*
*То мой шчаслівы неспакой...*
*І еду я ізноў на Рутку...*
*Зіма ў зімовым Навагрудку —*
*Старонка памяці маёй.*

# Пакарэнне Парыжа

**Валерыя Еўдакімава**

Юная беларуская мадэль Вікторыя Махота, якая заняла другое месца на прэстыжным міжнародным конкурсе “Форд Супермадэль свету-2007” у Нью-Йорку, будзе ўдзельнічаць у Тыдні высокай моды ў Парыжы. У сталіцу сусветнай моды Вікторыя адправіцца ў канцы лютага, дзе прыме ўдзел у паказах новых сезонных калекцый вядучых еўрапейскіх мадэльераў.

У якасці ўзнагароды за прызавое месца ў конкурсе мадэльнае агенцтва Ford Models заключыла з 15-гадовай прыгажуняй працоўны кантракт на тры гады на суму 150 тысяч долараў. Зараз Вікторыя займаецца ў Студыі моды Сяргея Нагорнага.

Беларусь ужо другі год запар займае прызавыя месцы на гэтым прэстыжным міжнародным конкурсе: летась тытул “Супермадэль свету” заваявала мінчанка Кацярына Даманькова. Высокія ўзнагароды — невыпадковы вынік, а заканамернае прызнанне прыгажосці беларускіх дзяўчат.

# Напярэдадні юбілею Напалеона Орды

**(Працяг. Пачатак на стар. 1)**

**— А ў нас, у Беларусі?**

*— Для святкавання 200-годдзя з дня нараджэння Напалеона Орды на нацыянальным узроўні быў створаны арганізацыйны камітэт, распрацавана праграма юбілейных мерапрыемстваў. Запланавана правесці ў Беларусі пленэр з удзелам мастакоў Беларусі, Літвы, Польшчы, Украіны ў месцах, якія паказаны на творах Орды (а іх пад дзве сотні), выпусціць мультымедыйны дыск з малюнкамі і запісамі музычных твораў юбіляра, выдаць найбольш поўны альбом твораў Орды і камплект паштовак, падрыхтаваць да дня святкавання тэматычных паштовых маркі і адпаведны канцэрт. Ці не галоўным будзе стварэнне ў Варацэвічах, на радзіме Орды, цэнтра традыцыйнай культуры. Для мясцовага музея вядзецца пошук архіўных дакументаў, набываюцца і робяцца ў Польшчы і Францыі копіі экспанатаў, звязаных з яго жыццём і творчасцю. У Мінску, у сядзібе Ваньковічаў па вуліцы Інтэрнацыянальнай, ужо дзейнічае юбілейная мастацкая выстава. Творы кампазітара ўключаюцца ў рэпертуары прафесійных і самадзейных калектываў. А ў Заслаўі адбудзецца канцэрт, прысвечаны Ордзе, якім будзе дырыжыраваць Міхаіл Фінберг.*

**— Што ж стане кульмінацыяй юбілею?**

*—Міжнародная канферэнцыя з удзелам прадстаўнікоў Літвы, Польшчы і Украіны. Пройдзе яна ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Галаўной установай-арганізатарам тут выступіць Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы. А вечарам пройдзе ўрачыстае пасяджэнне ў філармоніі. Будуць, безумоўна, мерапрыемствы ў Варацэвічах, Іванаве, абласных і раённых габрадах.*


**Палац Сапегаў у Ружанах (малюнак Напалеона Орды**

**— На заканчэнне сустрэчы яшчэ два кароценькія пытанні. Першае: відаць, Напалеон Орда — не адзіны сёлетні юбіляр ЮНЕСКА. Свет жа вялікі…**

*— Ведаеце, колькі юбіляраў на 2006–2007 гады? Шэсцьдзесят і тры! Назаву толькі некалькі прозвішчаў: Вольфгангу Амадэю Моцарту — 250, Ірэн Жоліо-Кюры — 100, Генрыху Гейнэ — 150, Карлу Гальдоні — 300, Івану Франко — 150. Стольki ж споўніцца Дзяржаўнай Трацццякоўскай галерэі, а Самарканду ва Узбекістане — цэлых 2750.*

**— А хто стаіць у нас на чарзе на наступны ці на наступныя два гады?**

*— На 2008 год — пачынальнік новай беларускай літаратуры Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. У апошнія гады ў свеце ўзрасла цікавасць да яго камедыі “Пінская шляхта”. А далей — Белавежская пушча: 600 гадоў таму назад намаганнямі кіраўнікоў Вялікага княства Літоўскага яна і па заканадаўству і фактычна стала заказнікам. Ну, а як вы ведаеце, пушчу, разам з палескімі балотамі, называюць лёгкімі Еўропы… Чым не годны юбілей?!*

**— То — пасляховых ордаўскіх урачыстасцяў! І — да новых юнескаўскіх юбілеяў! Бо, перакананы, кожны такі юбілей узмацняе прысутнасць беларускай культуры, беларускай дзяржавы ў свеце.**

**Гутарыў Адам Мальдзіс**

**Заснавальнік:** Рэдакцыя газеты «СБ»
**Рэдактар** Віктар Харкоў
**Адрас:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288–12–80; факс: +375 17 288–12–80
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290–60–11
**E–mail:** golas_radzimy@tut.by
Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк.
**Тыраж:** 2000
**Заказ:** 124
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.
**© “Голас Радзімы”, 2007**